

# Ярка-песенны сімфаніст

**Пайшоў з жыцця Алег Елісеенкаў — знакаміты кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, уладальнік прэміі Саюзнай дзяржавы і вельмі сонечны, адкрыты чалавек, які быў гатовы зрабіць яшчэ вельмі многа для нашай краіны.**

Беларусь стала для яго роднай. Тут аўтар пражыў практычна ўсё жыццё, хаця нарадзіўся ў Расіі. Пра гэтую акалічнасць нават не ўсе ведалі — настолькі творчасць Алега Елісеенкава была прасякнута беларускасцю. Не ўсе ведалі і тое, што яго набытак не абмяжоўваўся песнямі. Паўплывала адукацыя? Алег Мікалаевіч скончыў Маладзечанскае музычнае вучылішча, куды калісьці прыехаў выкладаць яго бацька, а потым Беларускую дзяржаўную кансерваторыю, дзе пераймаў вопыт у вядучага сімфаніста — народнага артыста нашай краіны Дзмітрыя Смольскага. Шырокую вядомасць атрымаў спачатку як аўтар выбітных акадэмічных твораў — яркіх, эксперыментальных, цалкам адпаведных найноўшым кірункам сучаснай музыкі.

Хаця б адна студэнцкая сімфанічная партытура ёсць у кожнага песенніка, які мае вышэйшую кампазітарскую адукацыю: інакш не відаць дыплома. А ў Алега Мікалаевіча было аж чатыры паўнавартасныя сімфоніі. Ды не абы-якія! Трэцяя з яе адточанай каляжнай тэхнікай, нечаканымі кантраснымі супастаўленнямі і цікавай тэмбравай драматургіяй увогуле зрабіла фурор. Кампазітару прадказвалі далейшыя сімфанічныя заваёвы — усесаюзнага і сусветнага ўзроўняў. А яго два маналогі на вершы Марыны Цвятаевай — сапраўдныя хіты: яны неаднойчы выконваліся на самых прэстыжных канцэртах у Беларусі і за мяжой, іх замаўлялі на творчых сустрэчах з кампазітарам. Тыя маналогі былі напісаны для мецца-сапрана: адзін увогуле без інструментальнага суправаджэння, а другі — з далучэннем не традыцыйнага ў такіх выпадках фартэпіяна, а... "каробачкі", як называюць гэты музычны інструмент у народзе. На згаданым міні-тэмпл-блоку заўзята іграў сам кампазітар, атрымліваючы асалоду ад канцэртнага музіцыравання.

А потым Алег Мікалаевіч пазнаёміўся з Аляксандрам Саладухам, які толькі пачынаў кар'еру, — і панесліся песня за песняй. Таму трэці перыяд елісеенкаўскай творчасці мог бы аб'яднаць павевы першых двух і быць звязаным з буйной формай, жанрамі мюзікла, рок-, поп-, лайт-оперы.

Няўмольны лёс распарадзіўся іначай. Можа, справа ў дзвюх шасцёрках? 21 верасня кампазітару споўнілася 66, і тыя лічбы ніяк не стасаваліся з яго светлым, сонечным характарам, бясконцым пазітывам, энергіяй, што літаральна біла праз край. Шматгадовае выкладанне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, удзел у канцэртах, фестывалях, рэгулярная праца ў складзе журы (і старшынёй журы таксама) — усё гэта было дапаўненнем да ўласна кампазітарскай творчасці. А колькі спевакоў абавязаны майстру тым, што менавіта ён "адкрыў" іх для шырокай грамадскасці, даў добры старт на эстрадным шляху. Алег Мікалаевіч быў чалавекам справы: ніколі не абяцаў упустую, пры ўсёй загружанасці заўсёды адгукаўся на творчыя прапановы. Вось і ў прэс-клуб "Культура і мастацтва" не так даўно завітаў — тая сустрэча надоўга запомніцца ўсім, хто да нас падключыўся, бо аўтар заўжды літаральна фантанаваў цікавымі гісторыямі і новымі ідэямі.

Пэўна, усё гэта спатрэбілася і на нябёсах. А нам засталася не толькі памяць пра Алега Елісеенкава, але і яго творы. І магчымасць зноў паслухаць і песні, і шматлікія іншыя кампазіцыі.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Алега Мікалаевіча Елісеенкава і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім творцы.